УДК 741+378.147.025.7

# Рысунак. Рашэнне праблемы інтэсіфікацыі вучэбнага працэссу і яе складаючыя

Барбарчык М.І.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Выкладчыкі падрыхтоўчага аддзялення, як дакладных, прыродазнаўчых, гуманітарных, так і творчых дысцыплін, укараняюць новыя вучэбныя формы и метады. Не выключэннем з’яўляецца дысцыпліна рысунак. З мэтай павышэння эфектыўнасці навучання рысунку прапаноўваецца дадаткова да праграмных заданняў выкарыстоўваць наступныя педагагічныя формы:

-*Дэманстрацыя наглядных дапаможнікаў.* Справа ў тым што на падрыхтоўчыя курсы часцяком паступаюць маладые людзі не маючыя спецыяльнай падрыхтоўкі па творчым дысцыплінам. Таму паказ рысункаў як няпасрэдна вучэбнага характара, так лепшых узораў графічнага мастацтва вялікіх майстроў дазволіць вызначыць для вучняў правільную арыентацыю ў вырашэнні пастаўленных перад імі задач. Паказ дапаможнікаў павінен праводзіцца ў час правядзення практычных заняткаў, як у традыцыйнай форме: стэнды, ілюстрацыі кніг альбо іх ксеракопіі, фондаўскія вучэбныя рысункі, а таксама аўдыя і відыя матэр’ялы з выкарастаннем медыя сродкаў.

-*Выкананенне зарысовак и накідаў.* Слухачы, якія навучаюцца рысунку, ў асноўным авалодваюць ведамі і уменнямі на практычных занятках. Але доўгае маляванне з выкарыстоўваннем вымяральных прыёмаў часам прыводзіць, рысуючага, да запрыгоньвання і інэртнасці. Добрым сродкам, дазваляючым пазбегнуць негатыўных наступстваў працяглага рысунка, з/яўляюцца зарысоўкі і накіды. Выкананне накідаў садзейнічае развіццю ў вучняў назіральнасці, прывучае хутка мысліць. Накід не патрабуе шмат часу (1-5хвілін), што дазваляе на практычных занятках спалучаць хуткае маляванне з працяглым.

-*КСР (кантралюемая самастойная работа).* Важным фактарам дазваляючым палепшыць якасць навучання рысунку з/яўляецца КСР. Пры самастойным выкананні вучэбнага задання ствараюцца ўмовы для актыўнага засваення навыкаў, выпрацоўцы свайго падыхода ў вырашэнні пастаўленых задач, рэалізацыі індывідуальных асаблівасцей. Заданнямі для самастойнай работы могуць быць рысункі, як з натуры, так і па памяці і ўяўленню, а таксама выкананне копій з работ вядомых майстроў. Кантралюемая самастойная работа садзейнічае фарміраванню свядомай самадысцыпліны, арганізаванасці і самакантролю, дзе выкладчык выконвае ролю кіраўніка-кансультанта.